**УДК 94(476).083**

# ПАЛЕМІКА ПА ПЫТАННІ АГРАРНАГА РАЗВІЦЦЯ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ НА СТАРОНКАХ ПРЭСЫ (ПАЧАТАК ХХ СТАГОДДЗЯ)

***А.П. ЦУМАРАВА***
***(Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова)***

*По матэрыялах прэсы даследуецца праблематыка аграрнага пытання, якая набыла асаблівую актуальнасць у 1905–1907 гадах. Паўночна-Заходні край ацэнены як небагаты сельскагаспадарчы рэгіён. Разгледжана крытыка прэсы ў адрас улады і адсутнасці відавочных рэформ. Прааналізавана ўзаемасувязь сельскагаспадарчага крызісу з сацыяльнымі і палітычнымі праблемамі, удзелам сялян у рэвалюцыі 1905–1907 гадоў, актывізацыяй міграцыі беларускіх сялян у Сібір і Амерыку. Раскрыта дыскусія вакол пераваги "польскага" і апалячанага землеўладання ў краі. Агульная пазіцыя землеўладальнікаў ахарактарызавана як выбар умеранага, легальнага шляху для правядзення рэформ у аграрным сектары. Асветлена работа землеўпарадкавальных камісій, іх узаемадзеянне з Сялянскім банкам. Раскрыты праект польскай краёвай прэсы па рэфармаванні аграрнага сектара з мэтай пераарыентацыі сельскай гаспадаркі на садоўніцтва, агародніцтва, пчалярства, вытворчасць малочных прадуктаў, будаўніцтва сыраробных заводаў, развіцця агароднінасушыльнай галіны. Прадстаўлены станоўчы партрэт заможнага селяніна. На падставе даследаваных матэрыялаў паказана, што многія прапановы актуальныя і ў сучасным свеце.*

Праблематыка аграрнага пытання набыла асаблівую актуальнасць у 1905–1907 гадах і займала значнае месца на старонках прэсы. Паўночна-Заходні край ацэнены небагатым сельскагаспадарчым рэгіёнам. Аграрнае развіццё беларускіх земляў было нераўнамерным ва ўсходняй і заходняй частцы, што прызнавалася на афіцыйным узроўні і не спрыяла стварэнню адзінай эканамічнай прасторы ў краі. Так, для абмеркавання і выказвання свайго стаўлення да "той формы аграрнага пытання, якая вылучана Дзяржаўнай Думай", планавалася склікаць абласны з'езд "сельскіх гаспадароў". Аднак у сувязі з рознымі ўзроўнямі аграрнага развіцця, ён быў падзелены на два параённых. Прадстаўнікі ўсходняй Беларусі ад губерняў (Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай) сабраліся ў Мінску; прадстаўнікі заходняй Беларусі і Літоўскіх губерняў – у горадзе Коўна [1].

Мэта даследвання – асвяціць палеміку ў прэсе па прычынах крызісу агранага сектара, вывучыць прапанаваныя праекты землеўпарадкавання, развіцця капіталістычных рыс у сельскай гаспадарцы і іх значэнне для грамадства. Выбар крыніц абумоўлены выключным значэннем СМІ у фармуляванні дыскурсу, хуткасці рэагавання на штодзённыя праблемы, уплывовасці на аўдыторыю.

**Асноўная частка.** Згодна з эканамічнай тэорыяй, прадстаўленай польскай прэсай, неспрыяльныя прыродныя ўмовы павінны былі садзейнічаць "сацыяльнай эвалюцыі", развіццю па інтэнсіўнаму шляху. У такім выпадку "аграрная беднасць" замянялася "прамысловай вытворчасцю". Аднак гэта было не характэрна дадзенаму рэгіёну. Рысамі вядзення гаспадаркі з'яўляліся "марнатраўнае выкарыстанне лясных рэсурсаў ..., адыёзная арэнда" [2; 3].

Звычайнымі "карцінамі" беларускага сялянскага жыцця апісаны "шэрае, саматканае адзенне, часта лапці замест ботаў, занядбаная, часам курная, з земляной падлогай, хатка, штогадовая нястача хлеба амаль заўжды з мякінай і бульбай" [4]. Беларуская прэса задавала пытанне: "Чаму ж той самы гаспадар-мужык інакшы на Украіне, у Літве, у Польшча, на Валыні?" [5]. Адзначана страшнае падзенне культуры беларускай вёскі, мясцовы селянін прадстаўляў "выключны" ў Расіі прыклад матэрыяльнай і духоўнай "галечы" [6]. У гэтым кантэксце газетай "Окраины России" вылучана задача: прыняць меры як мага "хуткага ўздыму". У прэсе знайшлі адлюстраванне штодзённыя праблемы сялянства: наяўнасць церазпалосіцы, шнуравой гаспадаркі, пытанні аб карыстанні лесам і лугамі, адсутнасць крэдытавання вёскі ("меліярацыйнага і іншага крэдыту амаль няма"), праблема беднасці арандатараў [7; 8]. Эканамічныя праблемы актывізавалі сацыяльныя: распаўсюд "пьянства, непрыстойнасці" [2].

Газета "Окраины России" тлумачыла, што праблема бязладдзя сялянскага побыту, галеча сельскай гаспадаркі ганьбяць "адукаванае грамадства". Стан вёсак і ніў, сялянскага насельніцтва апісаны, як бездапаможны, "рэжучы вока", асабліва ў параўнанні з замежжам. Палітыка дзяржавы ў аграрным сектары прызнана безвыніковай: сорак год пасля рэформы прайшло ў занятках "сезоннымі пытаннямі". Прычыны жаласнага стану бачыліся ў "палітыканстве лібералаў і кансерватараў". Меры ўрада па павышэнні дабрабыту сельскай гаспадаркі расцэнены леваманархічнай газетай як бюракратычныя, вынікам якіх стала толькі папаўненне дзяржаўнага архіва 28 тамамі актаў. У нявырашанасці аграрнага пытання бачыліся прычыны сацыяльнага расколу [9].

Пад'ём аграрнага руху ў краі на першым этапе рэвалюцыі 1905–1906 гадоў, на думку кансерватараў, быў ініцыяваны "рэвалюцыйнымі праграмамі ўскраін" [10]. Правая прэса падтрымала Пастанову

Савета Міністраў аб мерах процідзеяння аграрным хваляванням. Адназначна выказана падтрымка пазіцыі сельскіх таварыстваў, якія па сваіх прысудах выдавалі ў рукі ўлад актывістаў і ўдзельнікаў "аграрных беспарадкаў". Такая жорсткая пазіцыя апраўдвалася неабходнасцю і патрэбамі "смутных дзён" [11]. На падставе карэспандэнцыі газеты "Віцебскі Голас" аб прысудах сельскіх таварыстваў Віцебскай губерні, зроблена выснова, што прычыны аграрных хваляванняў не мелі "палітычнай афарбоўкі". Сяляне патрабавалі памяншэння арэнднай платы за землі, якія здаюцца ім памешчыкамі, забароны наймаць працоўных з іншых мясцовасцей і, такім чынам, працоўныя месцы аддаць карэнным жыхарам [12].

У прэсе адлюстравана актуальнае пытанне міграцыі беларускіх сялян у Сібір і Амерыку, абумоўленае, на думку польскай прэсы, адсутнасцю прамысловасці і працоўных месцаў [2]. Сярод губерняў з найбольшай колькасцю мігрантаў у Амерыку названы Ковенская, Віленская. У горадзе Тракі знаходзілася кантора па арганізацыі перасяленняў, у тым ліку нелегальных выездаў. Многія з'ехаўшыя ў Амерыку выклікалі туды сваіх сваякоў. Правая прэса ў ацэнцы гэтай з'явы зыходзіла з дзяржаўных інтарэсаў, адмоўна апісвала страту рабочых рук, выезд на заробкі ваеннаабавязаных, што выклікала па некаторых паветах "значны" недабор навабранцаў [13]. З гэтай думкай была салідарная газета "Kurjer Litewski" [2].

Для Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай губерняў быў характэрны накірунак эмігрантаў у Сібір. На прыкладзе Барысаўскага "найзбяднелага павета" газетай "Окраины России" разгледжана рашэнне праблем, якія ўзнікалі па куплі-продажы зямлі перасяленца. Зямельны надзел ацэньваўся ў 300–400 ці 500 рублёў. Гэтую суму адначасова селянін выплаціць не мог, таму зямлю набывала каталіцкая шляхта. Сярод прычын неплацежаздольнасці праваслаўнага селяніна названы адмова Сялянскага банка ў прадастаўленні пазыкі пры куплі дробных зямельных участкаў, а таксама маналікасць праваслаўных памешчыкаў, якія не маглі аказаць дапамогі. Зыходзячы з абароны "рускіх інтарэсаў" у краі, правая прэса прапаноўвала ўладам забараніць продаж сялянскіх зямель разначынцам, а дазволіць толькі ва ўласнасць іншых сялян; абавязаць Сялянскі банк выдаваць пазыку. Такім чынам, было магчыма задаволіць інтарэсы сялян [14].

Асаблівасцю Паўночна-Заходняга краю з'яўлялася перавага "польскага" і апалячанага землеўладання. Дадзеная рыса аграрнага сектара, вынікаючая з палітычнай, культурнай і рэлігійнай спецыфікі, з'яўлялася дыскусійным пытаннем у грамадскім абмеркаванні і на старонках прэсы. Адзначана, што палякі "моцна трымаліся зямлі". Такім чынам, землеўладанне для "польскага" элемента краю з'яўлялася падмуркам і апорай у далейшай культурнай і палітычнай барацьбе [15]. На думку землеўладальнікаў-каталікоў, прычыны крызісу сельскай гаспадаркі хаваліся ў эканамічным заняпадзе царскага рэжыму і ў палітычным ціску. Сваё становішча ў краі польскія землеўладальнікі расцэньвалі як фінансава стабільнае, давалі наступныя прагнозы ў газеце "Dziennik Wilenski": "у эканамічных адносінах вялікія сродкі, вялікі капітал доўга яшчэ будуць прыцягваць на наш бок працуючы люд" [16].

Правая прэса бачыла прычыны крызісу ў векавым "нічога нядзеланні" для "Белай Русі" "польскіх паноў", вынікам чаго з'явілася знясіленне эканамічных рэсурсаў краю, "перакідванне" дабрабыту за мяжу. Аграрнае пытанне, такім чынам, разглядалася ў цесным перапляценні з польскім нацыянальным і рэлігійным пытаннем. Польскія памешчыкі абвінавачваліся ў прадузятасці пры вырашэнні аграрных канфліктаў: на працу прымалі пераважна каталікоў, іх праца аплачвалася ўдвая. Сярод сродкаў падтрымкі "палякамі" сваіх прыхільнікаў указаны дапамога зямельных банкаў, выдача танных пазык [17].

У супастаўленні дастатку праваслаўнага і селяніна-каталіка адзначаны "параўнальны дабрабыт" апошняга. Доказам бядотнага становішча праваслаўнага селяніна з'яўляўся факт продажу хлеба, сабранага для насення, і продаж жывога інвентару, які спекулятыўна скуплялі габрэі. Правай прэсай габрэі прадстаўлены эксплуататарамі вясковай эканомікі, якія "высмоктвалі" з яе "апошнія сокі" [7].

У ліку прычын заняпаду сельскай гаспадаркі называлася дзейнасць "польскіх сельскагаспадарчых і земляробчых таварыстваў", крытыка якіх пачыналася з супастаўлення дзейнасці сельскагаспадарчых аб'яднанняў у Прусіі, Літве і Белай Русі [15]. Адзначана, што ў канцы XIX стагоддзя ў Прусіі налічвалася 2780 сельскагаспадарчых таварыстваў, у якіх удзельнічала больш 150 000 членаў, у Літве і Белай Русі ў гэты ж час сфарміравалася толькі некалькі такіх таварыстваў. На думку расійскай прэсы, у апошніх мінусам была немагчымасць удзелу простага люду, земляробаў. Сярод лепшых беларускіх таварыстваў названы мінскае і росіенскае. Правая прэса крытыкавала Віленскае сельскагаспадарчае аб'яднанне, яна лічыла дзейнасць многіх яго членаў намінальнай, бо яны ўступілі ў сферу іншых прафесій – сталі дактарамі, адвакатамі, чыгуначнымі агентамі, "сталі палітыканстваваць" і парвалі традыцыйную сувязь з сельскагаспадарчымі коламі [18].

Непакой правых сіл выклікала тэндэнцыя да аб'яднання сельскагаспадарчых таварыстваў у Паўночна-Заходнім краі. Так, Брэст-Літоўскае буйное аб'яднанне меркавала дзейнічаць салідарна з Ваўкавыскім і Слонімскім. У адрозненне ад правай прэсы, "Goniec Wilenski" падтрымаў гэты працэс, лічачы, што сельскагаспадарчае яднанне будзе больш плённым, чым культурнае [19].

Аграрнае пытанне было цесна пераплецена з палітычнымі пытаннямі, правядзеннем земскай рэформы, выбарамі ў Дзяржаўную Думу. Для выпрацоўкі агульнай праграмы актыўна дзейнічалі з'езды землеўладальнікаў. У Мінску старшынёй з'езда быў абраны Э. Вайніловіч, член Дзяржаўнага Савета [20]. Агульную пазіцыю землеўладальнікаў краю, выказаную на з'ездзе ў Вільні, можна ахарактарызаваць як

выбар ўмеранага легальнага шляху для дасягнення "пажаданых рэформаў" у аграрным сектары. Кадэцкая прагама па аграрным пытанні падвярглася рэзкай крытыцы. Член Дзяржаўнага Савета па выбарах ад землеўладальнікаў Паўночна-Заходняга краю І.О. Корвін-Мілеўскі назваў палітыку кадэцкай партыі "найвялікшым палітычным злачынствам". Таксама землеўладальнікі краю падзялялі погляд Цыбульскага аб неабходнасці ўтварэння сельскагаспадарчых гурткоў, па прыкладу Галіцыі і Букавіны. Да ўдзелу ў сельскагаспадарчым аб'яднанні дапускаліся сяляне за невялікую плату ў выглядзе членскіх унёскаў. Амаль усе выказаліся супраць гвалтоўнай экспрапрыяцыі [21].

Матэрыялы прэсы сведчаць аб змене дзяржаўнага курсу ў бок ўсведамлення неабходнасці рэформаў з мэтай "прывесьці сялянскае насельніцтва" да такіх формаў землекарыстання, пры якіх магчыма "правільнае вядзенне" сельскай гаспадаркі, падтрымка "асабістай ініцыятывы і прадпрымальнасці" гаспадароў. Прызнана, што існуючае землеўпарадкаванне прывяло сялян да "галечы, заняпаду гаспадаркі" і штогадоваму кармленню землеўладальніка "за кошт дзяржаўны, а значыць, за кошт таго ж народа" [22].

Важную функцыю ў рэфармаванні аграрнага сектара выконвалі землеўпарадкавальныя камісіі, дзейнасць якіх уважліва вывучалася прэсай. Стварэнне камісій у Паўночна-Заходнім краі пачалося з Вільні. Для вывучэння сітуацыі ў аграрным сектары былі створаны падкамісіі, якія распрацавалі правілы і формы збору статыстычных дадзеных па землеўладанні і землекарыстанні з мэтай усебаковага асвятлення эканамічнага становішча сялянства. Падкамісіі прапаноўвалі вывучэнне наступных прыватных пытанняў: "аб іпатэчнай запазычанасці, аб стане адыходных промыслаў і заробкаў, аб арэндзе ... паступаючых у распараджэнне павятовых землеўпарадкавальных камісій казённых і павятовых зямель" [23].

Прэса асвятляла ўзаемадзеянне землеўпарадкавальных камісій і Сялянскага банка. Так, камісіі ствараліся па ўказе ад 4 сакавіка 1906 года з мэтай садзейнічання Сялянскаму банку ў перапродажы памешчыцкай зямлі сялянам. Усе здзелкі Сялянскага банка павінны былі складацца толькі са згоды камісіі, усе канфлікты вырашаліся ў Пецярбургу саветам банка. Прэса шырока асвяціла дапамогу землеўпарадкавальнай камісіі ў пераходзе да хутарской гаспадаркі, крэдытаванні. На думку прэсы, пры аказанні дапамогі трэба аддаць перавагу "малазямельным перад беззямельнымі". У вызначэнні паняцця "малазямельны" прысутнічалі варыяцыі: па матэрыялах "Магілёўскага Весніка", селяніна лічылі малазямельным, калі на "душу мужчынскую" прыходзілася менш за 2 дзесяціны [24]. Крыху вышэй гэты паказчык быў у Рэчыцкім павеце і складаў "надзел да 2,5 дзесяцін" [25].

У Магілёўскай губерні ў працы землеўпарадкавальнай камісіі спрэчкі выклікала пытанне аб дазволе сялянам пры куплі зямлі браць пазыкі пад заклад гэтай жа зямлі. У выніку доўгіх і ажыўленых дэбатаў камісія вырашыла гэтае пытанне на карысць сялян, а таксама апісала працэдуру ацэнкі зямлі. Гэты працэс праводзіўся сумесна банкам і камісіяй, што павінна было ліквідаваць "спусташальную" для сялян маруднасць папяровых спраў. Прызнана неабходным садзейнічаць пераходу сялян да падворнай хутарской гаспадаркі і падтрымліваць іх пазыкамі на прылады працы, на ўздым культуры [26].

Польская краёвая прэса прапаноўвала свой варыянт "хуткіх і відавочных" эканамічных рэформаў, якія складаліся ў пераарыентацыі сельскай гаспадаркі на "садоўніцтва, агародніцтва, пчалярства, вытворчасць малочных прадуктаў", будаўніцтва сыраробных заводаў [27]. Вялікія магчымасці для інтэнсіфікацыі прапаноўвалі аграпрамысловыя выставы садоўніцтва ў Вільні, Мінску, Дзвінску, серыя выстаў буйной рагатай жывёлы [28]. На думку газеты "Kurjer Litewski", заняпад садоўніцтва сведчыў аб значным крызісе, таму што нават перспектыва прыбыткаў для ўласніка не была перавесам перад імгненнымі "невялікімі" выдаткамі на дрэвы [27].

Прыкладам паспяховага прадпрымальніцтва прыведзена дзейнасць перадавога гаспадара Балвід-Бамулта, які арганізаваў у Мінску агароднінасушыльны завод. Прадпрымальнік прапаноўваў новае бачанне ў сферы "трансфармацыі нашай сельскай гаспадаркі", пошуку "новых крыніц нацыянальнага дабрабыту". Агароднінасушыльная галіна апісана прагрэсіўнай, паспяховай, прыбытковай (32 % дывідэндаў). Мінскія заводы забяспечвалі перапрацаванай гароднінай расійскія рынкі, ажыццяўлялі ваенныя пастаўкі, прадукцыя экспартавалася ў Швецыю, Палестыну. Часта попыт перавышаў прапанову. На думку прадпрымальніка, адмоўнымі рысамі ў гаспадаранні было залішняе павелічэнне коштаў, імкненне дыктаваць густ спажыўцу [29].

Правая прэса таксама падтрымлівала новыя, капіталістычныя рысы, якія пранікалі ў вёску, працэс фарміравання сельскай буржуазіі з былых прыгонных. Прадстаўлены станоўчы партрэт заможнага селяніна. Ён ахарактарызаваны як "надзвычай працавіты", праяўляў індывідуальную энергію; не прапусціць выпадку "зарабіць капейку". Гэтым ён выгадна адрозніваўся ад аднавяскоўцаў. У гістарычным экскурсе адзначана, што толькі "рэформа 1863 года", вызваленне сялян "выклікала да жыцця" індывідуальную энергію. Селянін-уласнік расійскай прэсай бачыўся як антыпод пана і "польска-шляхецкага" прыгнёту [15].

**Заключэнне.** Эканамічнае развіццё Паўночна-Заходняга краю расійскай кансерватыўнай і польскай краёвай прэсай ацэнена як слабае, з рысамі крызісу. Прэса адкрыта крытыкавала стан аграрнага сектара. Абапіраючыся на сялян, правая прэса выступала супраць буйных "апалячаных" землеўладаль-

нікаў і допускала пераразмеркаванне зямельнай уласнасці. Падтрымлівалася станаўленне сельскай буржуазіі. Польская прэса прапаноўвала шэраг рэформаў для паляпшэння эканамічнага развіцця. Многія з іх, на наш погляд, актуальныя і ў сучасным свеце.

ЛІТАРАТУРА


1. Хроника // Окраины России. – 1906. – № 17. – С. 297.
2. Ostroróg-Sadowski, J. Uprzemysłowienie Litwy / J. Ostroróg-Sadowski // Kurjer Litewski. – 1905. – № 1. – Wilno, czwartók, dnia 1 (14) wrzesnia. – С. 2.
3. Z handlu drzowem // Kurjer Litewski – 1905. – № 4. – Wilno, niedziela, dnia 4 (17) wrzesnia. – С. 3.
4. Свой. Обозрение событий и окраинная жизнь. Гродно // Окраины России. – 1908. – № 15–16. – С. 236–237.
5. Юлька з Моладава. Велики час // Беларуски календар «Нашае Нивы» на 1913 г. – Вильно: М. Кухты. – 1913. – С. 87–89.
6. Обозрение событий и окраинная жизнь. Вильна // Окраины России. – 1910. – № 18. – С. 271.
7. Эльфи. Обозрение событий и окраинная жизнь. Вильна // Окраины России. – 1906. – № 43–44. – С. 741.
8. Якия невыгады шнуравой гаспадарки // Першы Беларуски календар «Нашае Нивы» на 1910 г. – Вильно: М. Кухты. – 1910. – С. 41.
9. Неустройство крестьянского быта и хозяйства // Окраины России. – 1906. – № 12. – С. 205–206.
10. Передовая // Окраины России. – 1906. – № 1. – С. 6.
11. Хроника // Окраины России. – 1906. – № 5. – С. 82.
12. Обзор печати // Окраины России. – 1906. – № 3. – С. 58.
13. Письмо белоруса // Окраины России. – 1907. – № 15. – С. 241.
14. Обозрение событий и окраинная жизнь. Минск // Окраины России. – 1908. – № 24. – С. 368.
15. Обозрение событий и окраинная жизнь. Вильна // Окраины России. – 1909. – № 31–32. – С. 460–461.
16. Обозрение событий и окраинная жизнь // Окраины России. – 1908. – № 3. – С. 39.
17. В «Русском окраинном обществе» // Окраины России. – 1909. – № 18. – С. 268.
18. Обозрение событий и окраинная жизнь. Вильна // Окраины России. – 1908. – № 22. – С. 332–334.
19. Обозрение событий и окраинная жизнь. Вильна // Окраины России. – 1908. – № 47. – С. 678.
20. Съезд землевладельцев в Минске // Окраины России. – 1906. – № 24. – С. 406–407.
21. Текущие вопросы из Северо-Западного края // Окраины России. – 1906. – № 32. – С. 531.
22. Обозрение событий и окраинная жизнь // Окраины России. – 1906. – № 39. – С. 662.
23. Хроника // Окраины России. – 1906. – № 24. – С. 408.
24. Обозрение событий и окраинная жизнь // Окраины России. – 1906. – № 28. – С. 479.
25. Хроника. Экономическая жизнь // Окраины России. – 1906. – № 25–26. – С. 427.
26. Хроника // Окраины России. – 1906. – № 29–30. – С. 494.
27. Sadownictwo i owocarstwo // Kurjer Litewski. – 1905. – № 9 – Wilno, niedziela, dnia 11 (24) wrzesnia. – С. 2–3.
28. Rosienie. Wystawy // Kurjer Litewski. – 1905. – № 11 – Wilno, sroda, dnia 14 (27) wrzesnia. – С. 2.
29. Minsk. Suszenie warzyw // Kurjer Litewski. – 1905. – № 13 – Wilno, piątek, dnia 16 (29) września. – С. 3.


*Паступіў 18.09.2013*

## HE CONTROVERSY ON THE AGRICULTURAL DEVELOPMENT OF THE NORTH-WESTERN TERRITORY IN THE PRESS (EARLY XX CENTURIES)

***A. TSUMARAVA***

*In the article on the press materials studied problems of the agrarian question, which has become particularly relevant in 1905–1907. North-Western Territory assessed affluent agricultural region. We consider the criticism of the press to the government and the absence of reforms. The relationship of agricultural crisis with social and political problems involving peasants in the revolution of 1905–1907, activation migration Belarusian peasants in Siberia and America. Revealed the superiority of the discussion about the "Polish" estates in North-Western Territory. Common position of the landowners described as moderate choice, legal way for reforms in the agricultural sector. Lit work surveying commissions, their interaction with the Farmers Bank. Disclosed the project boundary of the Polish press to reform the agricultural sector to reorient agriculture horticulture, gardening, beekeeping, dairy, cheese factory building, the development of vegetable dehydration industry. By presenting the portrait of a wealthy farmer. On the basis of the materials studied, the author believes that many of the suggestions are relevant to the modern world.*